**Блажэвіч, Э.** Жыць, апярэджваючы час / Э. Блажэвіч // Міёрскія навіны. – 28 лют. – С. 2.

## ЖЫЦЬ, АПЯРЭДЖВАЮЧЫ ЧАС



### Першыя крокі

Рабочы стаж Сяргея Аляксандравіча Мацвеева перакуліў на трэці дзесятак. За гэты досыць доўгі прамежак часу многае адбылося, многае змянілася. Але якім бы вірлівым і імклівым ні было жыццё, мінулае не сціраецца з памяці. Яшчэ ў 1985 годзе (закончыўшы тэхнікум, адслужыўшы ў арміі) юнак, поўны энергіі, працаўладкаваўся на Міёрскі камбікормавы завод майстрам па будаўніцтву. Завочна паступіў вучыцца ў Наваполацкі політэхнічны інстытут на будаўнічы факультэт. Калі ў раёне стала развівацца прадпрымальніцкая дзейнасць, вырашыў стварыць будаўнічы кааператыў. Было гэта ў 1989 годзе. У першую чаргу выконвалі заяўкі камбікормавага завода на рамонтна-будаўнічыя работы, бо размяшчаліся на яго базе. Напрыклад, пабудавалі для прадпрыемства два дамы, у адным з якіх, дарэчы, цяпер і жыве Сяргей Аляксандравіч – была прадастаўлена льгота на пазачарговае атрыманне жылля, бо служыў у Афганістане, адкуль вярнуўся, на радасць родным, не толькі жывым і здаровым, але і з медалём.

### Школа мужнасці

У політэхнічны тэхнікум паступіў Сяргей Мацвееў пасля заканчэння васьмігодкі. У лютым 1983 года закончыў яго. А ў сакавіку прызвалі на службу ў армію. Тры месяцы знаходзіўся ва Узбекістане, праходзіў курс маладога байца. Трапіў у артылерыйскія войскі. Атрымаў ваенную спецыяльнасць вылічальніка (кіраванне агнём артылерыі). У Афганістане полк, у якім служыў юнак, уваходзіў у склад дывізіі, што ўдзельнічала ў ваенных аперацыях па ліквідацыі мяцежнікаў. Так што ён адзін з тых, каму спаўна давялося паспытаць ліхалецця той вайны. Многае давялося перажыць, многаму навучыцца, многае зразумець.

– За што атрымалі медаль? – цікаўлюся ў Сяргея Аляксандравіча.

– Напэўна, чакаеце якога-небудзь захапляючага эпізода? Не было! Проста мы выконвалі заданне. Аднаго разу, калі наша палкавая калона рухалася ў раён баявых дзеянняў, трапіла ў засаду. Пачаўся абстрэл. Для знішчэння варожай агнявой кропкі неабходна было ўстанавіць яе дакладнае месца размяшчэння. Гэту задачу паставілі перад карэкціровачнай групай. Бесперашкоднае перамяшчэнне яе забяспечвала група прыкрыцця, у склад якой уваходзіў і я, –

расказвае Мацвееў. – З задачай салдаты справіліся. Пасля іх наводкі трапны артылерыйскі агонь знішчыў праціўніка.

Пасля ўдалай аперацыі на грудзях маладога байца зазіхацеў медаль «За баявыя заслугі». Гэта ўсяго невялічкі эпізод з армейскіх будняў Сяргея Аляксандравіча. Служба ў арміі на тэрыторыі Афганістана загартавала яго і фізічна, і маральна. Ён з асаблівай павагай адносіцца да ўсіх, хто прайшоў шляхамі Афгана.

– Гэта святое! – зазначае воін-інтэрнацыяналіст. – На афганскай вайне маладыя хлопцы, не задумваючыся, у экстрэмальных сітуацыях рызыкавалі ўласным жыццём. Тыя пачуцці, якія давялося кожнаму з нас перажыць, нельга перадаць словамі, ды і не заўсёды гэта патрэбна.

У Афганістане вясковы хлопец прайшоў сапраўдную школу мужнасці і сталення. А таму і ў далейшым не палохаўся цяжкасцей, крочыў насустрач ім і пераадольваў.

**Адпрараба да інжынера**

Кіруючы работай будаўнічага кааператыва, Сяргей Аляксандравіч у поўнай меры праявіў свае арганізатарскія і прафесійныя здольнасці. Калі з-за шэрагу аб'ектыўных прычын кааператары вымушаны былі прыпыніць дзейнасць – у 1991 годзе Мацвееў зноў вярнуўся на камбікормавы завод, толькі ўжо ў якасці прараба.

Не пералічыць, якія работы выканала будаўнічая брыгада на чале з Сяргеем Аляксандравічам. Хаця ўжо чацверты год ён узначальвае на прадпрыемстве інжынерную службу, многае нагадвае пра той перыяд – і новы ўтульны магазінчык, і, прыгожа аздобленыя драўнінай, рабочыя кабінеты адміністрацыйнага будынка, вытворчыя пабудовы... І цяпер Мацвееў кантралюе работу будаўнікоў. Нядаўна абнавілі інтэр'ер у сталовай. Заканчваецца рэканструкцыя і рамонт душавых, дзе сцены абкладзены новай пліткай. А каб ад водаправоднай вады яна не рудзела, ды і рабочыя маглі мыцца, не хвалюючыся за сваё здароўе, вырашылі ў бліжэйшы час на прадпрыемстве ўстанавіць лакальную станцыю па ачыстцы вады ад жалеза. Ужо ёсць адпаведная дамоўленасць на выкананне работ з мінскай фірмай «Амазон».

Але асноўныя клопаты ў інжынера пра тэхнічнае забеспячэнне вытворчасці. Важна для яго, не толькі каб бесперапынна падавалася электраэнергія, працавалі надзейна ўсе механізмы, але і павялічвалася вытворчасць прадукцыі, захоўваліся правілы тэхнічнай і пажарнай бяспекі, паляпшаліся ўмовы працы.

– Сёння на заводзе ўстаноўлены дзве зернесушылкі. Але ў перыяд жніва пры масавым паступленні збожжа з-за іх нізкай прапускной здольнасці мы не паспяваем сушыць зерне. Запланавалі закупіць на прадпрыемстве «Амкадор-Можа» зернесушылку «СЗК-15» і ўстанавіць яе да жніва, – дзеліцца планамі галоўны інжынер. – Установка высокапрадукцыйнага, энергазберагаючага абсталявання важна ў эканамічным плане.

Паведаў Сяргей Аляксандравіч і пра тое, што сёлета будзе камп'ютэрызавана вагавая, што дасць магчымасць аператыўна весці ўлік і справаздачнасць, павялічыць прадукцыйнасць працы. А ў наступным годзе плануецца замяніць машыну па вытворчасці круп. Гаварыў Сяргей Аляксандравіч пра тэхнічнае абнаўленне ахвотна, з цікавасцю. Кампетэнтны ён, дарэчы, не толькі ў тэхнічных пытаннях. У полі яго зроку ўся дзейнасць прадпрыемства. І гэта не дзіўна, бо ён «правая рука» дырэктара. Калі кіраўнік у водпуску ці камандзіроўцы, то даводзіцца выконваць яго абавязкі.

## Давер калектыву

Вярнуўшыся з Мінска з двухтыднёвых курсаў па павышэнню кваліфікацыі, Мацвееў даведаўся, што калектыў вылучыў яго кандыдатам у дэлегаты на трэці Усебеларускі народны сход.

– Ёсць у нашым калектыве і іншыя такія ж адказныя работнікі. Да прыкладу, вызначаецца руплівасцю загадчык аддзела маркетынгу Сяргей Мікалаевіч Зінкевіч – малады, ініцыятыўны, граматны. Але вылучылі Сяргея Аляксандравіча. У яго больш жыццёвага вопыту. Ён Афганістан прайшоў, што немалаважна, – гаворыць дырэктар завода Віктар Антонавіч Паляк.

– З якім настроем едзеце на форум? – пытаюся ў інжынера.

– На маю думку, у нашай рэспубліцы надаецца належная ўвага развіццю прамысловай вытворчасці, што, канешне, радуе. Давялося мне наведваць Расію, Украіну.

Там многія дробныя прадпрыемствы не працуюць. Не ўсё і ў нас гладка, сельская гаспадарка да нядаўняга часу з'яўлялася слабым звяном. Мяне гэтае пытанне вельмі хвалюе, бо наша прадпрыемства працуе на сыравіне, якую пастаўляе вёска.

Што да работы нашага завода, то мы не толькі трымаемся, як кажуць, на плаву, але і забяспечваем рост вытворчасці. У нас няма цякучасці кадраў. Рабочыя своечасова атрымліваюць досыць высокі заробак. Несумненна, ёсць пэўныя праблемы, але яны вырашаюцца.

## І ў сям'і – на сваім месцы

Як падкрэслілі завадчане, Сяргей Аляксандравіч і ў сямейным жыцці на сваім месцы – добры бацька, прыкладны сем'янін, руплівы гаспадар.

Сыну Дзмітрыю ўжо 15 гадоў – той узрост, калі бацькавы парады і падтрымка вельмі патрэбны. А галоўнае – яго цвёрдае слова і асабісты прыклад.

У хаце ёсць камп'ютэр. Як зазначае Сяргей Аляксандравіч, дзеці абавязкова павінны дасканала валодаць тэхнікай, за якой будучыня. Хаця злоўжываць не трэба.

Мацвееў вельмі любіць сямейны адпачынак на прыродзе. Нярэдка разам з жонкай, сынам і сябрамі ездзіць летам на возера. Загаралі, купаліся, займаліся спортам. А вечарам песні ля начнога вогнішча. Усё гэта добра бадзёрыць.

Два гады запар у час водпуску Сяргей Аляксандравіч з сям'ёй на ўласнай машыне ездзіў «дзікуном» на Чорнае мора ў Місхор.

– Нармальна! – усміхаецца Сяргей Аляксандравіч. – Не толькі добра адпачылі, але і нядрэнна пазнаёміліся з мясцінамі, з людзьмі, якія там жывуць. Дарэчы, гаспадар, у якога мы прыпыняліся, беспрацоўны, бо прадпрыемства, дзе працаваў, распалася. Цяпер там многія зарабляюць летам, аказваючы якія-небудзь прыватныя паслугі адпачываючым, але гэта не дае ім стабільнага грашовага даходу.

Сямейны адпачынак на прыродзе Мацвеевым на пэўны час давялося прыпыніць – у сям'і з'явілася маленькая дачушка Аляксандра, якой яшчэ толькі годзік.

Сяргей Аляксандравіч любіць іграць на гітары. Хаця цяпер гэты музычны інструмент «перакачаваў» да сына. Той разам з сябрамі імкнецца стварыць свой ансамбль.

## Ад зямлі

Нарадзіўся Мацвееў у вёсцы, дзе праца на зямлі – справа звыклая. Таму і не імкнуўся мець у горадзе кватэру са зручнасцямі. Ля яго дома 9 сотак зямлі. Жонка – Надзея Міхайлаўна – з Міёр,

таксама звыклая да гаспадарчай працы. На прысядзібным участку садзяць агародніну. Растуць побач з домам яблынькі, кусты з ягадамі.

А на дадатковым участку за горадам, які складае 20 сотак, вырошчваюць бульбу. Для апрацоўкі зямлі набылі трактар. Гэта тэхніка выручае і ў многіх іншых выпадках. Ды і родным, знаёмым іншы раз даводзіцца дапамагаць. Падтрымліваць «Т-40» і ўвесь глебаапрацоўчы інвентар у належным стане – справа Сяргея Аляксандравіча. Патрабуе догляду і бэўшны «Фольксваген», які заўсёды на хаду. І ён не менш патрэбная, а можа і, нават, важнейшая, чым трактар, у быце тэхніка. Без яго не абысціся. Заўсёды пад рукамі. То ў магазін трэба, то на працу, то дзіцяці ў паліклініку адвесці, што не блізка, бо дом размешчаны амаль за горадам.

* * *

Развітваючыся са сваім субяседнікам, прашу прабачэння за «ўкрадзены» час.

– Яго чалавеку заўсёды не хапае. Чым больш спраў, тым карацейшы дзень. Гэта заканамернасць. Весь і даводзіцца спяшацца, каб паспець зрабіць запланаванае, жыць, апярэджваючы час. І гэта прыемна, – усміхаецца Сяргей Аляксандравіч.

А мне не менш прыемна пазнаёміць нашых чытачоў з гэтым цікавым чалавекам.

**Э. БЛАЖЭВІЧ**